№ 67 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перасылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на $1/2$ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Віленская 33. Адрэс адміністраціі і экспэдыціі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 68 (264). Год III. Вільня, 30 жніўня 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

29 жніўня.

Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і гэнэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: На полі бітвы на поўдня ад Аррас, на поўдня ад Скарп рана нараніцы зламалася англіцкая атака пад нашым агнём. Каля палудня непрыяцель пачаў з новай сілай свае спробы прарыву нашага фронту. Між Скарп і руччом Сансэ ён пяць разоў пачынаў свае атакі. Агнём і контратакамі мы кожны раз адкідалі непрыяцеля. Цэнтрам заўзятай бітвы быў Буарі-Нотр-Дам. Два разы мы выкідалі контратакай непрыяцеля з руін вёскі. Пад вечар непрыяцель узяў яе. Набапал дарогі Арра-Камбрэ непрыяцель штурмаваў сем разоў. Панцырные аўтомобілі, прыкрывалі пяхоту, што штурмавала густымі масамі. Агонь нашых кулямётаў і артылерыі зламаў штурмы. Дзе непрыяцель урываўся ў нашую пазіцыю, мы выкідывалі яго зусім контратакай. Вапом абстрэліваўся цяжкім англіцкім агнём. На поўнач ад Сомм непрыяцель пачаў нанова свой штур між Флер і Кюрлі. Ля Гардкур ён уварваўся ў нашыя лініі, але мы яго адкінулі контратакай. Між Сомм і Уаз нашые арыергарды зьдзержывалі наступаўшага ворага і адыходзілі потым назад. Вораг атакаваў нашые старые лініі пры Нюаён, але знайшоў іх ужо пакінутымі. Места цяпер ляжыць перад нашым баевым фронтам. На поўнач ад Энь Французы і амэрыканцы ўзноў пачалі свае штурмы, у некаторых мясцох да пяцёх разоў. Яны былі адбіты самымі с цяжкімі стратамі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 28.III. На просьбу партыі Бацькаўшчыны да Гіндэнбурга аб весьці аб ім, ён адказаў тэлеграмай: „Дзякуй Богу я зусім здаровы і з верай гляджу ў будучыну".

ЛОНДОН (Рэўтэр). 28.VIII. Войскі саюзьнікаў пад Архангельскім разсеялі рэчны флот большэвікоў.

ВЕНА. Суцтан пачне на гэтых днёх свае візыты да двароў цэнтральных дзержаў.

БЭРЛІН. „Ізвестія" наказываюць, што Пуцілаўскіе заводы павялічылі сваю вытворчасьць на 13%, а балтыцкі завод дзеля будаваньня паравозаў—у $1^1/_2$ разы, выпускаючы ў месяц 8—9 паравозаў. Праца эканамічнага савету ярка выяўляецца. Дзеля павароту дысцыпліны між работнікамі савет пастанавіў адбіраць сыр'ё ад фабрык, каторые не даходзяць вымаганай вытворчасьці.

ГААГА. Газэты наказываюць, што ў Амэрыцэ пануе дыктатура. За пагромы немцаў нікога не караюць. Старопнікаў міра і соцыалістаў, каторые выступаюць проці ваеншчыны, арэштоўваюць, а іх газэты закрываюць.

ЛОНДОН. «Daily News» наказывае, што сіня фэйнэры ў Ірляндыі маюць у гэты мамэнт 1.660 клюбаў—на 426 больш, чымся летась, а такжэ вялікіе грошы. На спадзеваных выбарах у англіцкую Ніжнюю Палату яны выставяць 90 кандыдатаў і спадзяюцца поўнай пабеды.

ГААГА. С прычыны ня выдачы саюзьнікамі пашпартаў на міжнародную царкоўную конфэрэнцыю ў Швэцыі голяндзкіе газэты пішуць: „хто пэўны ў справядлівасьці свае работы, таму нема чаго баяцца стычнасьці з непрыяцелем на міжнароднай конфэрэнцыі.

ВЕНА (В.Т.Б.). 27.VIII. Імператар Кароль зволыніў чэрнавіцкага мітрапаліта Рэпту ад спаўненьня яго абавязкаў за тое, што пасьля заняцьця Букавіны маскалямі Рэпта загадаў ва ўсіх цэрквах маліцца за расейскага цара і яго сям'ю.

ХРЫСТЫАНІЯ (В.Т.Б.). 27.VIII. Генэрал Маннэргэйм прыехаў сюды сягоньня і прабудзе некалькі тыдняў. Карэспандэнтам газэт ён сказаў, што грамадзянскую вайну можна лічыць закончэнай. Весткі аб тэрроры „белай гвардыі"—брахлівы. Край повен энтузіазму. Есьць пэўнасьць удачы ў адбудове Фінляндыі.

МАСКВА. 28.VIII. Японскі генэральны консул с служачымі японскага пасольства выехалі адгэтуль, маючы пропускі ад большэвіцкага ўраду з загадам, каб ім ніякіе ўласьці не рабілі пры выезьдзе прашкод.

БЭРЛІН. 9 жніўня ў 12 гадз. дня 5 маленькіх бэльгійскіх рыбаловак з Эйста пры раскіданьні сваіх сетак былі абстрэляны двума англіцкімі аэроплянамі без дай прычыны. Жыхары абурэны гэтым крывавым паступкам.

ЖЭНЕВА. Урад Злучэных Штатаў зрабіў умову з італьянскім урадам, каб італьянцы ў Амэрыцэ адбывалі ваенную павіннасьць у амэрыканскім войску, а амэрыканцы ў Італіі—ў італьянскім.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). 27.III. Новы ваенны закон аб рэкрутах прыняты сэнатам.

ВЕНА. 29.VIII. Урадова. **Албанскі фронт.** Між Янінай і Ваюзай і ў гарах Томор непрыяцель утварыў новы фронт.

БЭРЛІН. 28.VIII. Граф Ронікер выехаў учора ў Варшаву дзеля перэгавораў з міністэрствам і дзержаўнай радай. Гр. Ронікер цяпер офіцыяльна прызнан за пасла.

Беларускіе Вучыцельскіе курсы у Сьвіслачы.

Ад 15 кастрычніка 1918 г. да 15 жніўня 1919 г. ў Беларускай Сэмінарыі ў Сьвіслачы будзе адбывацца новы элемэнтарны курс для беларускіх вучыцялёў і вучыцеляк.

Адпаведные кандыдаты і кандыдаткі ад 18 да 30 гадоў могуць заяўляцца ў сваіх крэйсамтах мясцовые—проста ў кіраўніка курсамі, інспэктара Бэндзехі, у Сьвіслачы. Там жэ яны даведаюцца аб варунках прыёму.

Вільня, 30 жніўня 1918.

Бадай, ніводзін з народаў, паняволеных царскай Расеей, не ўзіраецца на цяперашніх валадароў яе з вялікшым зацікаўленьнем, чым беларусы. Большэвікі, апавесьціўшы прынцып самаазначэньня нацыянальнасьцей — хоцьбы ў форме поўнага аддзяленьня ад Расеі, дзержацца гэтага прынцыпу толькі ў адношэньні да народаў, каторые адпалі ад Расейскай дзержавы і ў гэты мамэнт ужо прызнаны незалежнымі. Каліж каторы з іх папрабуе самаазначыцца заўтра, або самаазначыўся ўжо, ды ня быў прызнаны большэвіцкім урадам, — о, для такога народу права на самаазначэньне ўжо перэстало мець сілу! І мы пільна сочым за ўсімі здарэньнямі ў Расеі, бо ведаем, што маскалі толькі тады прызнаюць незалежнасьць Беларусі, калі іх да гэтага *прымусяць*.

Палажэньне, якое ўтварылося ў Расеі ў апошніх часох, цікава з розных паглядаў. Ужо даўно мы чуем і чытаем, што большэвікі дажываюць апошніе дні, што народ у найбліжэйшым часе іх скіне і т. д. Аднак, месяц за месяцам мінае, а савецкі ўрад усё яшчэ дзержыць уласьць у сваіх руках і нават выяўляе ўсё больш арганізацыйных здольнасьцей. — Праўда, нема слоў: палажэньне большэвікоў—вельмі цяжкое, ім прыходзіцца бароцца і с контррэвалюцыей, і с чэха-славакамі, і с саюзьнікамі. А найцяжэйшая барацьба—гэта барацьба з голадам. І ўсё-ж такі большэвіцкіе войскі неяк даюць сабе раду з усімі ворагамі, толькі ня з голадам: гэты вораг — найстрашнейшы.

Голад — гэта і ёсьць глаўная прычына, каторая вызывае нездавольства ў шырокіх масах народу. На ім спэкулююць і контррэвалюцыанеры. Але разам с тым голад — гэта і саюзьнік большэвікоў: ён у значнай меры становіць прычыну зацягіваньня разьвязкі ўнутрэнага палітычнага крызісу ў Расеі.

Справа вось у чым. Перш-наперш, большэвікі — гэта ядыны сільны арганізацыйны цэнтр. Нема іншай партыі, іншай арганізацыі, **каторая ў гэты мамэнт здалела-бы** ўзяць у свае рукі праўленьне гасударствам. Буржуазные і небольшэвіцкіе партыі хаваюцца ад сьвету Божага, бо большэвікі вядуць з імі адкрытую барацьбу. Мы ў апошнім нумэры прынесьлі вестку аб утварэньні блоку кадэтаў, народных соцыалістаў, соцыалістаў рэвалюцыанэраў і меньшэвікоў, — але і гэты блок пакуль-што яшчэ тайны, яшчэ ўкрываецца і ня можэ выступіць да адкрытай барацьбы за ўласьць. Мала таго: ён і ня хочэ *цяпер* уласьці. Ня хочэ, бо тады трэба было бы ўзяць на сябе перад народам адказ за абарону ад голаду, с каторым большэвіком гэтак цяжка даць сабе раду. Наадварот: контррэвалюцыанеры спадзяюцца, што голад будзе ім за найлепшага саюзьніка проці большэвізму, бо на грунце голаду найлягчэй вясьці агітацыю проці большэвікоў. Калі ж бы сягоньня адбылася контррэвалюцыя, дык новые валадары Расеі мелі-бы перад сабой тую-ж задачу, якая стаіць перад большэвікамі, і ім — прынамсі ў першым часе—было-бы йшчэ цяжэй бароцца з голадам, чым сяк-так прыспасобіўшымся ўжо да гэтага большэвікоў. А гэта зразу пазбавіло-бы іх уселякае пашаны і веры народных мас.

Можна сьмела сказаць: калі большэвіком і суджэно зыйсьці са сцэны, дык гэта не адбудзецца ані заўтра, ані пазаўтра, а толькі тады, як Расея неяк уладзіць справу забаспечэньня сваіх жыхараў ядомінай. Толькі тады і пачнецца новы акт крывавай расейскай трагедыі: барацьба за ўласьць між партыямі.

„Савецкі ўрад падаў нямецкаму ўраду сваё прэдлажэньне, у форме жаданьня, каб нямецкі ўрад апрача ўжо прызнаных гасударстваў не прызнаваў ніякіх новых, якіе бы меліся яшчэ утварыцца на расейскай тэрыторыі".

«Köln. Ztg.».

Статс-сэкрэтар заграпічных спраў, ф. Гінце, на нарадзе с прэдстаўнікамі партый заявіў, што ён лічыць берасьцейскую ўмову за бязспорную аснову свае палітыкі на Усходзе. *«Voss. Ztg.»*.

„Жыды на Беларусі“.

I.

Пад такім загалоўкам вядомы беларускі пісьменнік друкуе на страніцах менскай газэты «Беларускі Шлях» сваю працу аб беларускіх жыдох. Глыбокае знаёмства с тэмай робіць працу З Бядулі асабліва цікаўнай: праўду кажучы, хаця жыды крэпка ўкараніліся на Беларускай зямлі, хаця мы сустрэкаемся з імі на кожным кроку,—незнаёмства з іх мовай аддзеляе іх ад нас кітайскім мурам, за каторы глянуць мала каму ўдавалося. А хто заглянуў туды, той мо' з задзіўленьнем перэканаўся-бы, што і гэты чужы на пагляд народ паддаўся чарам зямлі Беларускай, што беларускіе наплывы—бяз ведама самых жыдоў — глыбока праніклі ў іх душы...

Дый іначэй быць не магло: лішне доўга жыве ў нас жыдоўскі народ, лішне блізка спатыкаецца ён з беларусамі, каб на ім не адбілося супольнае з намі жыцьцё. Сьляды беларушчыны, як кажэ Бядуля, можна знайсьці ў жыдоўскай мове, звычаях, легендах, у будоўніцтве, у будзенным жыцьці. Есьць народные жыдоўскіе мэлёдыі, перамешаные з беларускімі; ёсьць беларуска жыдоўскіе прыказкі («Ня добра рэйдэлэ, а добра мэйнэлэ» і інш); ёсьць вельмі пекная песьня, якая пачынаецца словамі: «Абраам, Абраам, татуня ты наш....» і канчаецца па гэбрайску,—ды шмат ей падобных. У свой час, у 1911 — 1912 г.г, жыдоўскі журналіст, Гурвіч, у Вільні зьвярнуў на гэта ўвагу, сабраўшы цэлы зборнік жыдоўска-беларускіх прыказак. Наагул, кажэ Бядуля, «магутная сіла Беларускай зямлі надала асобны духоўны і зьверхні облік беларускім жыдом. Цяпер яны розьняцца ад усіх другіх жыдоў, і іх на ўсім сьвеце называюць «літвакамі»... Калі мы глянем на жыдоўскае мястэчка на Беларусі, то пабачым на кожным кроку нешта роднае, сваё ў будоўлях і ва ўсей абставе. Узяць жыдоўскіх пісьменнікаў з Беларусі,—то і ў іх творах чуецца заўсёды беларуская прырода — «родные зьявы». Больш за ўсіх гэта адбіваецца ў творах жыдоўскага клясыка Абрамовіча (Мэндэле Мойхэр Сфорым) с Капыля. І ў другіх галінах штукарства ў тутэйшых жыдоў чуецца беларускі дух... І не адпаведаюць праўдзе заявы большасьці антысэмітаў, што жыды не маюць пачуцьця каханьня да тае зямлі, дзе яны жывуць. Гэта было-бы проціў законаў прыроды. Адно толькі—гэта цяга да бацькаўшчыны ў іх аб веяна асаблівым трагізмам. З аднае стараны—жыцьцё на чужыне соткамі гадоў, дзе цюкалі іх розные антысэміты і жыдаеды, хочучы ня толькі зьнішчыць іх фізычна—пагромамі і грабежствамі а так сама апаганіць іх душу — іх рэлігію пад відам розных крывавых нагавораў і крытыкі тальмуду. З другой стараны—далёкая Палестына, з якой яны выгнаны ўжо 2.000 гадоў, акрапляла самабытнай расой у душы кожнага жыда тое карэньне, якое зьвязывае яго з зямлёй, дзе ён жыве. Яго каханьне да новай бацькаўшчыны—нэрвовае, балючае, незразумелае прэдстаўніком другіх нацый..»

Зьмітрок Бядуля, здаецца, першы ў беларускім пісьменстве прабуе прыадкрыць нам душу жыдоўскага народу, укрытую за незразумелай нам мовай і зьверхнімі формамі. І за гэта яму трэба сказаць дзякуй: жывучы з жыдамі на аднэй зямлі гэтулькі вякоў, мы *павінны* ведаць, чым і як жыве гэты народ, *павінны* зразумець яго асаблівую душу, адменную ад нашай.

II.

Гожэ адзначыць, што і жыды—асабліва ў апошніе гады перад вайной—пачалі выяўляць зацікаўленьне беларускай нацынальнай справай. Мы тут ня будзем гаварыць аб беларуска-жыдоўскіх адносінах на палітычным грунце: гэткіе адносіны ўстанавіліся ад першых-жэ дзён беларускай палітычнай работы. Падамо за Бядуляй толькі жменю данных аб тэй цікавасьці, якую выявілі жыды да беларускага культурна нацынальнага руху.

«У 1913 гаду паказаўся ў жыдоўскім журнал: «Ді Ідішэ Вэльт» у Вільні першы артыкул аб беларускім адраджэньні Пасьля гэтага гурток жыдоўскіх „краёўцаў“ надумаў выдаваць жыдоўскую краёвую газэту «Унзэр Гэгэнд» («Наш Край»), каб знаёміць шырокую жыдоўскую публіку с тутэйшым краем, а ў гэтым і з беларускім рухам, з беларускай літэратурай і г. д.,—але па розным прычынам гэта ім не ўдалося. У 1914 году гэты самы гурток выдаў па жыдоўску зборнік «Літва», дзе былі перэклады з беларускай і літоўскай літэратур і артыкулы аб беларускім руху. Вельмі горача адклікнулася на гэты зборнік уся жыдоўская краёвая прэса і ставіла ў прыклад рупнасьць беларусаў да адраджэньня свэей нацынальнай культуры жыдоўскім асымілятарам. Як мы ўжо пасьля даведаліся, гэты зборнік „Літва“ нарабіў вялікага шуму ў Амэрыцы—паміж інтэлігэнтными жыдамі з Беларусі. Да друку быў прыгатаваны і другі зборнік „Літва“, с перэкладамі вершаў Янкі Купалы, апаведаньняў М Гарэцкага і г. д.,—але хутка, у часе вайны, расейскі ўрад забараніў друкаваць па жыдоўску».

Сваю цікаўную працу З. Бядуля канчае аглядам становішча жыдоўскага грамадзянства ў беларускай справе наагул і ў справе тварэньня незалежнай Беларускай дзяржавы і выказывае, якіе с-паміж жыдоўскіх элемэнтаў прыхільны да гэтага, якіе выступаюць проці беларусаў. Усё-ж такі, аканчацельны вывад Бядулі аб беларуска-жыдоўскіх адносінах — оптымістычны:

«Як далей пойдуць нашы стасункі з жыдамі — тут не бярэмся судзіць. Ва ўсялякім прыпадку жыцьцё гэтых дзьвёх нацый так цесна зьвязано, што кожная з іх прымушэна цікавіцца другой ужо хаця-бы з экономічнага пункту. Экономічная струна—вельмі чулая і шчакотная рэч. Да гэтай рэчы, як ні як, кожны прыкладываецца шчыра зацікаўленым вухам. Недалёкая будучына нашага краю мае перад сабой пэрспэктыву розных селянскіх коопэрацый і гандлёвых рэформ, што можэ зусім інначэй паставіць увесь лад гандлю ў нашым краю. Вось, дзеля гэтага варта жыдом болей уважна задумывацца над доляй сваіх блізкіх суседзяў, з якімі яны так зьвязаны экономічна. Мы пэўны, што адносіны будуць у нас самые прыязные. Варункі новага жыцьця, грамадзянская воля і роўные правы ўсім—бяз розьніцы веры і нацыі так загладзяць няроўнасьці і ў экономічных стасунках, што пакрыўджэных ня будзе!»

Дай-жэ, Божэ, гэтак!

І. Мелешка.

У Вільні і ваколіцах.

Для падпісчыкаў.

Дзеля таго, каб нашы падпісчыкі на правінцыі атрымлівалі „Гомана“ акуратна, яны павінны **надпісывацца на газэту праз свайго старшыню (Amtsvorsteher) або праз Kreishauptmann'а.** *Інначэй почта газэты не перэсылае.*

Адміністрацыя.

× **Пажар у летніх калёніях для дзяцей** У Чорным Бары (9 вёрст ад Вільні) у адным з дамоў, займаных пад летніе калёніі для бедных дзяцей Таварыствам «Золак», у начы з 23 на 24-е жніўня выбух гвалтоўны пажар ад прылегаючай да печы сьцяны, які сьперша абхапіў левые крыло дому, дзе памешчаліся хлебапекарня і прачкарня. У доме гэтым закрам хлебапекарні памешчаліся яшчэ школа і спальні на 35 дзяцей. Пажар узьняўся, калі ўжо ўсе дзеці спалі—а гадзіне 11 ай. Першы заўважыў пажар спаўшый пры дзецях вучыцель сьпеву п М Дунаеў, які тойчас і пачаў будзіць дзяцей, але ўжо дзецям, спаўшым на другім паверсе полымя адрэзало дарогу: гарэлі дрэўляные сходы. Дзеці кінуліся на бальнон і некаторые з іх пачалі скакаць у ніз, рэшту здолела выратаваць падасьпеўшая помач даглядчыц, вычыцеляк і суседзяў мужчын, з якіх п. Мацей Станкевіч, сын арэндара Чорнага Бору, найболей выказаў самаахвярнасьці. Ня гледзячы на энэргічную помач, 4-ра дзяцей сталіся ахвярай агню Спаліліся Жэмло Ядвіга 7 г., Гэрман Яніна 11 г. Петрусэвіч Стэфанія 7 г., Маркевіч Міхаліна 5 г. Астанкі спаліўшыхся: некалькі жменяк костачак часова зложэны на блізкім магільніку да хрысьціянскага пахаваньня. Рэшта ўсе дзеці выратаваліся саўсім здаровымі, і непакалечэнымі.

У складах згарэла дзяцінная бялізна на 100 душ, адзежа і пасьцельные зьмены, а такжэ ўсё, што

Піліп Міласэрны.

(*Беларуская казка*).

Жыў так сабе ў вёсцы Піліп Міласэрны. Ен—хто прыдзець усякага дорыць, усякага жалееца,—ведама, чалавек міласэрны. Але сам сабе надумаўся: пайду ў сьвет, пашукаю, ці ёсьць такі чалавек, як я? Ну п йшоў. Зайшоў ён у дом—так дом стаіць—зайшоў ён на нач, у лесе. А ў тым доме стары—то разбойніцкі дом. Ну, тады папрасіўся ён там на нач. Не адзін быў стары было ў яго сыноў там сем ці восем, і іх ня было тады. Ен, той стары, кажа: лезь за печку дый начуй! Позна вечаром прыяжджаюць сыны з разбойніцтва. І стары, іх бацька, пытаецца: а што, ці папалася сяньні што, вырабіць каго?—Не, кажа, сяньні нідзе не папала нічога!—Ну, дык вячэрайце, кажа, ды едзьце абкрадзеце Піліпа Міласэрнага, аднак нічога не папала! А ён, Піліп Міласэрны, за печкай гэта чуе, дый кажа: браткі! наця вам ключы, ня псуйце замкоў, дый вазьмеце, што хочаце! Тады яны кажуць: хто-ж ты такі?—А я-ж, кажа, той самы Піліп, куды вы едзеце красьці,—той самы ён!.. Добра.—Як-жа ты, што? Куды ты йдзеш? пытаюцца ў яго.—Я, кажа іду глядзець, ці ё такі чалавек, як я, у сьвеце! Ну, тады той разбойнік кажа: аднак, кажа, пайду і я з табой: ці ё гэтакі чалавек, як я ўжо?.. Ну ідуць яны ўжо ў двух. Гэна быў разбойніцкі двор, а то зайшлі яны ў злодзейскі. Ну там яны нічога: злодзей той пусьціў іх начаваць: хто вы, што, куды йдзіцё?—А я, кажа, Піліп Міласэрны, дару ўсіх, усякага жалею! І разбойнік кажа: а я, кажа, разбойнік,—жыву з разбойніцтва, каб што папалася, вырабіць каго. Ідзём у сьвет глядзець ці ё такія людзі, як мы ў сьвеце! Ну тады і злодзей той кажа: ну, пайду і я з вамі шукаць, ці ё ў сьвеце такі чалавек, як я. Ідуць яны ўжо ў трох. І ўвыйшлі ў лес цёмны, сустракаець іх стары, мусіць Бог. Давай у іх распытавацца—што за людзі, куды йдзіцё? Ну, той кажа: я Піліп Міласэрны! А той: я разбойнік! А той: я злодзей! Прызналіся ўсе сваёй прычынаю. Абняла іх цёмная ноч. Стары паказаў ім на тры дарогі: ты, Піліп, ідзі гэтай дарогай начаваць, а ты гэтай, а ты гэнай! Пайшлі яны. Прыйшоў Піліп, стаіць дом,—сьвечкі гараць: хлеб, соль, проскуркі, то, сё,—пасьцеля паслана. Вось кажа: вячэра стаіць, стравы, але няма нікога ў доме! Павячэраў, Богу памаліўся, і лёг спаць. Назаўтрага ўстаў, вадзіца стаіць і ручнікі вісяць. „Хаця-б сказаў дзякуй каму, хвала табе Божа, усяго дос было—дык і няма каму! кажа той Піліп. Выйшаў на тое месца, дзе разлучыліся, і стаў ждаць іх, пакуль зьбяруцца.

А разбойнік цёмнай ночай як пайшоў, увыйшоў у сад. Як стала бура, як стала сучча па ім хлёпаць! Ен уцікаць. Куды прыбяжыц—замёт! куды прыбяжыць—замёт. Бегаў, бегаў, а сучча па ім, па ім, хлёп ды хлёп! Бегаў, бегаў цэлую ноч. Даў Бог зару—няма нійдзе нічога.

А злодзей прыйшоў да рэчкі. Ляжыць кладка на рэчцы. Пайшоў ён па кладцы і ўваліўся ў ваду, і тонець. Дык ён абшчапіўся рукамі за кладку і нагамі заклаў за верх, і ўсю ноч плаваець. Даў Бог зару і няма ні рэчкі ні кладкі.

Тады сабраліся ўсе ізноў, усе трое, на тое месца. І пытаюцца тады адзін у аднаго: якоў ім начлег быў. Піліп кажа: мне, хвала табе Божа усяго было дос, толькі ня было каму дзякуй сказаць!.. А разбойнік кажа: а я бегаў па садзе ўсю ноч і сучча мяне біло. Куды прыбягу—няма куды ўцечь; назад пабягу—ўзноў б'ець!.. А злодзей кажа: як пайшоў я па кладцы, увваліўся, дык і абшчапіўся за кладку рукамі і нагамі, ды ўсю ноч і плакаў так: і пусьціць нельга і выплысьць няма як у начы!.. Тады разбойнік пачаў прасіць Піліпа: „Ты, значыцца, чалавек добры! дай мне пакуту: я буду пакутаваць!“ Тады Піліп узяў яблынкавы кол і ўбіў: „насі, кажа, ваду ротам і палівай гэты кол к. Калі гэты колік прымецца і зацьвіціць і стануць яблыкі на ім, дык тады табе Гасподзь грэх даруе!“ А злодзей так сьцёрся, пайшоў няма ведама куды, і грэх не дараваны яму.

Пайшоў Піліп дамоў і стаў царкоўным старастам. Шмат прайшло гадоў. Паехаў Піліп з папом у Магілеў, у губэрню. Едуць гэта яны ў Магілеў,—запахнул яблыкі ля дарогі, у лесе. Ен кажа на папа: «бацюшка: пахнуць яблыкі; дзесь недалёка яблынка стаіць. Трэба пакінуць, ды пашукаць яблыкаў!» Узяў і пайшоў. Прыходзіць туды,—апазнаў тое месца, а то не пазната зусім. І разбойнік яго апазнаў: а, кажа, ты Піліпачка! — Я!. Адзін аднаго пазналі. Роспыт пайшоў: з кім ты едзеш, што, куды? Ен кажа: з папом еду ў Магілеў! Той разбойнік пачаў яго прасіць: а мілы ты мой Піліпачка! вядзі мяне да папа,—хай мяне паспаведуець! Поп яго паспаведаў, разграшыў яму ўсе грахі. Як разграшыў, тут разбойнік і памер і сьвят стаў.

было у спальнях, і часьць адзежы і бялізны пэрсоналю.

Дзеці павыбегалі у адных кашулёнках. Адзежа і бялізна была сабрана ў пачатку тыдня ад дзяцей да мыцьця, памытая і папрасаваная лежала у складзе на суботнюю зьмену, перад нядзеляй 25.VIII., у якую меўся адбыцца дзіцячы тэатр, меў выступаць хор дзіцячы і былі паспрошэны на гэты фэст госьці з Вільні і з ваколіцы. **В. Л.**

× **„Сувязь Культурна-Нацыянальнага Адраджэньня Беларускага Народу“.**—У суботу, 24.VIII, у школьнай салі Т-ва «Zolak» (Бэрнардынскі завулак № 7) адбыўся Устаноўчы Сход Сувязі К. Н. А. Б. Н. У Камітэт Сувязі выбраны: Ксёндз Владыслаў Толочко, Ксёндз Ян Семашкевіч, Барон Казімір Шафнагель, п. Вінцэнт Сьвятаполк-Мірскі, п. В. Ластоўскі; у кандыдаты: п. Станіслава с Кіселёў Корф, п. Адам Страўсс.

У надзорчую Раду выбраны: п. Ян Русецкі, п. Владыслаў Драмовіч, п. В. Волосэвіч, п. Пётр Вонсовіч, п. Міхал Петкевіч. Сабраньне закончыў маршалкаваўшый п. В. Ластоўскі прамовай аб патрэбе стварэньня пры Сувязі бібліотэкі аб беларусаведаньні і зачаткаў музэя, а такжэ аб патрэбе утварэньня сэкцый і работы у іх.

Часовы адрэс Сувязі К.-Н. А. Б. Н. Завальная вуліца № 7 (Беларуская кнігарня), там-жэ прыём заяў аб паступленьні у члены Сувязі і часовае Бюро Сувязі. Членская складка 10 марак у год; кандыдаты ў члены павінны мець рэкомэндацыю двох членаў Сувязі і прымаюцца Камітэтам. **В. Л.**

× **Прапаўшый чэлавек.** Каля 5 тыдняў таму назад прапаў бяз весьці работнік Іван Мешкоўскі з Вэркаўскай вул. 36. Весткі аб ім трэба падаваць у паліцыю.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дві была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
26—27	+ 19,7°	+ 8,2°
27—28	+ 13,1°	+ 8,0°
28—29	+ 18,1°	+ 7,2°

З усяго Краю.

Польскіе апэтыты.

„Stokholms Dagblad“ 14 жніўня пішэ:

„У Літве ёсьць некалькі сот палякуючых памешчыкаў, ды часьць мястовых жыхараў дзержацца польскай орыентацыі. Даўно вядома, што польская статыстыка стараецца паказаць, быццам Літва — чыста польская зямля. Але палякі не здаволіваюцца аднэй толькі Літвой. Яны маюць некалькі сот тысяч сваіх землякоў у Беларусі і Украіне і затым хочуць заўладаць і гэтымі землямі. Тады будзе створэна папраўдзе вялікая Польшча, каторая с падмогай саюзьнікаў можэ стацца другой Расеей. Што ў гэтай другой Расеі будуць народы, якіе ніколі не перэстануць дабівацца вызваленьня ад польскага ярма,—гэта, здаецца, зусім не цікавіць саюзьнікаў. На гэта паказвае гісторыя іх саюза з Расеей“.

З менскага жыцьця.

МЕНСК. 1 верасьня ў памяшчэньні «Darlehenskasse Ost» на Катэдральным пляцу адкрываецца першая краёвая выстаўка, арганізовая 10 арміей Мэта выстаўкі—паказаць старабытнае беларускае мастацтва. Выстаўка будзе адкрыта кожын дзень ад 10 да 6 гадз. Плата за ўход—20 фэн. Каталёгкі ў беларускай, нямецкай, расейскай і польскай мове — па 40 фэн. у касе.

= У суботу, 24 жніўня, «беларускі народны тэатр» пад кірункам Ф. Аляхновіча ставіў у «Беларускай Хатцы» п'есу свайго дырэктара «Манька». Спэктакль прайшоў вельмі ўдачна.

25-га там-жэ ігралі інсцэнізацыю п. Аляхновіча «Чорт і Баба». П'еса вызвала ў салі нямоўкнуўшый сьмех і сустрэла гарачы прыём публікі.

27-га ставіцца ізноў «Кветка папараці».

Дзеля неспадзеваных прычын спэктаклі «Беларускага народнага тэатру» ў Бабруйску перанесены на 5 і 6 верасьня.

У сераду, 28 га жніўня, «першае т-ва беларускай драмы і камэдыі» пад рэзысэрствам Ф. Ждановіча паставіло ў «Беларускай Хатцы» драму «Хам» і камедыю «Міхалка».

Арганізацыя моладзежы.

ІВЕНЕЦ, Менск. губ. У мястэчку Івенцы арганізаваўся беларускі нацыянальны кружок, злучаючый тутэйшую беларускую маладзеж. Кружок стаўляе сабе выключна культурна прасьветные і нацыанальны задачы. Ініцыатары яго — п.п. Мя. куць, Абрамовіч і інш.

ГОРАДНЯ. Тут ізноў выкрылі 3 патайные бровары. Валадзельцы іх паштрафованы на 200 да 1.000 марак.

У адну з апошніх начэй паліцыя задзержала 3 зладзеяў з Ліды, каторые ўжо ехалі да хаты с пакрадзеным дабром с трох крадзежаў з узломам. Адзін з лідзкіх зладзеяў—хлопец 14 гадоў.

ГОРАДНЯ. Работнік Юльян Раманчук, 21 году, украўшый у ваенным тартаку два дарагіе раменные пясы, засуджэн на 1½ году ў вастрог.

Перад наступаючай зімой мястовае ўпраўленьне прыгатавало для незаможных людзей опраткі, якіе прадаюцца па прыступнай цане.

Гэтак сама прыгатоўлен запас дроў для бедных, каторым іх прадавацімуць па 1 м 20 ф. за пуд.

БЕЛАСТОК. За апошніе дні тут былі дзьве крадзежы ў начы. Зладзеі ўлезьлі ў кватэры і, ня гледзячы на тое, што ў іх спалі людзі, чыста іх абакралі. У адным здарэньні нават выбралі грошы с-пад падушкі у спаўшай кабеты.

БЕЛАСТОК. Хлопец 16 гадоў, Гайдоўскі, каторага дзержалі пад арэштам у крымінальнай паліцыі, зрабіў дзіру у каменнай сьцяне і ўцёк. Вырваўшыся на волю, ён ізноў учыніў кражу з узломам, ды яго ізноў злавілі.

ДЗЯТЛАВА. Міравы суд аштрафаваў возьніка Цемерынскага, краўца Контаровіча і рымара Зімярынскага за недазволены гандэль коньмі ад 500 да 1.000 м.

АЎГУСТОЎ. Дзеля будоўлі 4 дамоў на 2 сям'і кожын с 4 складзікамі шукаюць падрадчыкаў. Заяўляцца на пісьме або на словах не пазьней 10 верасьня: *Sägewerk II (Тартак), у Аугустове.*

ГАЛЫНКА. Селяне Міхал Пятровіч і Станіслаў Тарасэвіч укралі с поля 35 снапоў. Яны засуджэны як за кражу і як за «набыцьце ўраджаю без пазваленьня крэйсгаўптмана“.

ПАБІРЦЫ. Тутэйшы ксёнд на просьбу маткі наказывае аб прапажы трох дзяцей Гродзінскіх: Язэпа, Станіслава і Браніслава. Яны пайшлі за хлебам ды с таго часу не варочаліся.

СУВАЛКІ. У тую пятніцу тут закончыліся 4-тыднёвые паўторные курсы для вычыцялёў і вучыцялек.

СУВАЛКІ. За першые сем месяцаў сёлета ўкрадзены ў тутэйшым павеці каля 50 каней.

МАР'ЯМПОЛЬ. У тутэйшым павеце за першые сем сёлетніх месяцаў укралі каля 70 каней.

ОЗКУСВІЛЬСАЙ, Мар'ямп. п. Гэтымі днямі тут прайшла страшэнная навальніца. Град даходзіў увелькі галубінага яйка. На вуліцах і на палёх ён пабіў многа птушак.

КОУНА. Сюды прыехалі 29 членаў главнай камісіі нямецкага Рэйхстагу.

КОЎНА. У тую нядзелю на раніцы згарэло шмат дрэўляных дамоў пры вуліцы Вільгэльма (б. Мікалаеўскай). 80 сямей асталіся пад голым небам.

У тую нядзелю адгэтуль выехаў новы транспорт эмігрантаў у Расею. Апрача мэбляў, яны мелі магчымасьць забраць с сабой усё дабро.

КОЎНА. Маладая жыдоўка, ўцёкшая перад немцамі разам с сваімі дзяцьмі, вярнуўшыся, знайшла мужа з другой жонкай. Гэта зрабіло на яе гэткае ўражэньне, што яна тут-жэ сканала ад разрыва сэрца.

АЛЕСАНДРАУСК. Ад падпалу згарэлі дом, гумно і аборы Разаліі Маркул. Падпаліўшые ліхадзеі ўцяклі.

МАЦКУНЫ. У тую нядзелю, у 7 гадз. вечара, тут забілі ўдаву Мар'яну Матоловіч, як здаецца, праз помсту.

РЭВЕЛЬ. Тут канчаюць будаваць вялікі ледакол «Hanza», каторы яшчэ ў гэту зіму будзе ачышчаць рэвельскі рэйд ад лёду.

ДОРПАТ. Тут установлено ваеннае ўпраўленьне Балтыцкім краем замест ранейшага ўпраўленьня армейскай каманды.

Афіцыяльны аддзел.

Апісаньне „Darlehnskassenschein'аў“ Пазычковай Касы Ост на 5, 20 і 50 марак.

Darlehnskassenschein'ы надрукованы на белай паперы з водным відочным пры разгледаньні знакам. Гэты водны знак складаецца з раўнамерна раскінутага па ўсяму полі ўзора састаўленага с шасьці простолінейных фігур у форме „Z“, каторые концэнтрычна разьмешчэны ўвакруг шасьцівугольнай зьвязды. Фігуры састаўлены с шырокіх ліній, каторые, так само як і зьвезда цёмна выдзеляюцца на глаўным фоне паперы. Пры ўсім гэтым абодвы знакі маюць тонкіе, абмяжовываючые іх з аднэй стораны, лініі сьвятлейшые ад агульнага фона паперы. У роўнай меры сьветлымі павінны быць так сама літэры „G“ і „D“, каторые, зьменяючы адна адну, памешчаюцца у сярэдзіне шальц вугольнай зьвязды.

„Darlehnskassenschein'ы“ на 5 марак маюць у шырыню 115 мм. удоўжкі 90 мм. На пярэдняй старане, пад астаўленым полем белай паперы, знаходзіцца каля 5 мм. шырокі дробна ўзорысты грунт з орнамэнтальнай, каля 4 мм. шырыні, абрамоўкай сьветла сіняга колеру. Унутры гэтага грунту памешчэна вялікая, багата аздобленая крывымі лініямі, віньета, састаўленая с цесна сплеценых між сабой ліній сьветла-сіняга і сьветла бурага колераў. У сярэдзіне гэтай віньеты знаходзіцца вялікая арабская цыфра „5“, аздобленая сьветла-зялёнымі і сьветлабурымі лініямі і с шырокім ценем сьветла-сіняга колеру.

Скрозь апісаную віньету і цыфру праходзіць у чатырох радкох — першы паўкругам, другіе ў простай лініі — ніжэй паданы тэкст, надрукованы лацінскім адвесным аздобным шрыфтам:

„Darlehnskassenschein
Fünf Mark
Kowno, den 4 April 1918
Darlehnskasse Ost“.

Улева і ўправа ад другога і трэйцяга радка знаходзіцца па вялікай арабскай цыфры „5“.

Ніжэй чацьвёртага радка стаяць тры подпісы - факсіміле:

„Fischer“ „v. d. Marwitz“ „Moritz“ ніжэй пад гэтым, дробным тонкім шрыфтам у двох аднальковай даўжыні радкох аб'ясненьне:

„Die Einlösung der Darlehnskassenscheine der Darlehnskasse Ost in „Reichsmark zum Nennwert ist vom Deutschen Reich gewährleistet“. (Выкуп Darlehnskassenschein'аў Пазычковай Касы Ост у номінальнай вартасьці нямецкай маркі заб спечэн нямецкім гасударствам)

Увесь тэкст, абедзьве вялікіе цыфры „5“, так сама і подпісы надрукованы цёмна бурым колерам.

Апрыч таго, на пярэдняй старане памешчэн у двох адбітках чырвонага колеру нумэр білету з літарай сэрыі; адзін раз — у верхнім правым вугле грунту; другі раз — ўлеве, пад вялікай цыфрай „5“.

Адваротная старана білету мае за агульны грунт багатую ўзорамі віньету сьветла-сіняга і сьветла бурага колераў, так сама ўсярэдзіне з вялікай аздобнай арабскай літарай „5“ у тых самых двох колерах, што і віньета, с шырокім сьветласінім ценем.

Шрыфт уведзенага тексту і тут так сама лацінскі, адвесны, цёмнабурага колеру і так мо парадкам надрукованы, што вялікая цыфра „5“, памешчэная у сярэдзіне служачай за грунт віньеты, у большай свэй часьці астаецца свабоднай.

У верхняй палавіне адваротнай стараны знаходзіцца нямецкі тэкст. Ен пачынаецца далікатным дробным шрыфтам ўдоўж верхняга краю у двох радкох — адзін даўжэйшы, другі каротшы; і гэта текст карны:

„Wer Darlehnskassenscheine nachmacht oder verfälscht, oder nachgemachte oder verfälschte sich verschafft und in Verkehr bringt, wird mit Zuchthaus bis zu acht Jahren bestraft“. (Хто Darlehnskassenschein'ы будзе падрабляць або фальшаваць або падробленые ці фальшаваные набываць і пускаць у рух, таго караціимуць да восьмі гадоў папраўчым домам).

Ніжэй гэтага стаяць словы:

„Darlehnskassenschein
Fünf Mark“

(Закладная кредытка пяць марак) у двох радкох, с каторых першы падымаецца у сярэдзіне паўкругам. Улева і ўправа ад гэтых абодвых радкоў знаходзіцца па вялікай цыфры „5“ цёмна - бурага колеру.

На левай ніжняй палавіне адваротнай стараны ў чатырох радкох, с каторых першы паўкругам, памешчаецца літоўскі тэкст: „Skolinamosios kasos ženklas Penki s Markes“ а пад гэтым, бліз ніжняга краю білета, дробным далікатным шрыфтам у трох аднальковай даўжыні радках — літоўскі карны тэкст:

„Kas padirba melagingus skolinamosios kasos ženklus arba tikruosius perdirba arba padirbtus ar perdirbtus ima ir juos i vartojimą skleidžia, bus baudžiamas katorgaikiaštuonių metų“.

На правай сподняй палавіне адваротнай стараны ёсьць гэткі латыскі тэкст:

Aisdewu
Kases shme
Peezas
markas

у чатырох радкох, с каторых першы паўкругам у яшчэ ніжэй, на роўнай вышыні з літоўскім карным тэкстам, улева надрукаваны такім самым дробным шрыфтам у трох аднальковай даўжыні радкох латыскі карны тэкст:

„Kas aisdewu kafes shmes pakaltaifs waj wilto, waj ari pakalta fitas waj wiltotas fewegahda un ziteem isdod, tas teek fodits ar spaidudarbeem lihds astoni gadeem“.

(Далей будзе).

Украіна.

КІЕУ (П.Т.А.). У Новачэркаск прыбыла ўкраінская дэпутацыя з граматай Скоропадзкага да атамана Краснова. У грамаце высказываецца жаданьне падджержываць добрые суседзкіе зносіны.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 27.VIII. Сягоньня паабедзе расейскіе і нямецкіе паўнамочнікі падпісалі тры дадатковые ўмовы да берасьцейскага міра: палітычную, фінансовую і аб прыватнай уласнасьці.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Англіцкі пасол у Маскве, Лёкгард, атрымаў ад нямецкіх уласьцей пазваленьне свабодна праехаць цераз Нямеччыну, пакідаючы Расею.

МАСКВА (П.Т.А.). 25.VIII. **Ваеннае апавешчэньне.** На ўсеньскім усходнім фронце мы наступаем вельмі ўдачна. Пад Новаузенскам, самарскій губэрні, казакі адбіты з вялікімі стратамі. Пад Мікалаевскам, сама ск. губ., разьбіты чэха-славакі; мы здабылі шмат ваенных матэр'ялаў. Мы наступаем на Сызрань. У ваколіцах Казані мы заўладзілі Чырвонай гарой.

МАСКВА. 26.VIII. **Ваеннае апавешчэньне. Усходні фронт:** У кірунку на Алапаев мы занялі ў бітве Сухайлінскае, Таўшкіну і Качаноўскае. Ворагі ўцяклі ў поўным безладзьдзі. Пад Сімбірскам ідуць вострые бітвы. Пад Казаньню войскі, пасьля крывавай бітвы, адыйшліся на лінію ракі Сасункі. У ваколіцах Вяткі белая гвардыя заняла Уркум.

Увэчары, 15 жніўня, у Пецярбурзе пачалося паўстаньне аружных афіцэраў. Паўстанцы часова занялі некалькі станцый між Ямбургам і Гатчынай. Нашы войскі абязброілі контррэвалюцыанераў.

МАСКВА (П.Т.А.) 27.VIII. **Ваеннае апавешчэньне:** Упорные бітвы пад Сімбірскам разьвіваюцца ў памысьным для нас кірунку. На паўночным ваенным тэатры англа-французы робяць разьведкі на самалётах. У ваколіцах Казані наша пяхота б'ецца за апанаваньне Чырвонай Гарой, катораю мы абстрэліваем берэгавымі батарэямі і з волжскага флоту. На правым беразі мы йдзем упярод.

ГААГА. Апрыч французаў і англічан ў Архангельску высадзіліся такжэ амэрыканцы. У Сібір с Канады выслана брыгада.

ШТОКГОЛЬМ. У Іркуцку чэхаславакі ўстанавілі ўрад пад назовам: „цэнтральны ўрад сібірскай рэспублікі“. Галава яго—Гучков.

ЛОНДОН. „Times“ паказывае с Харбіна, што на фронце Уссурі казакі страцілі 4 гарматы. Чэхі і англо-французы адступілі на 6 міль. Палажэньне—сур'ёзнае. Ад учасьця японцаў ждуць разрыву чыгункі між Владывастокам і Харбінам.

ТОКІО. **Урадова.** 20 жніўня ворагі зноў пачалі атакі проці першай лініі чэха-славакоў. Палажэньне чэха славакоў—цяжкое, бо японцы яшчэ не дайшлі да фронту.

МАСКВА. „Правда“ друкуе дэкрэт цэнтральнага спаўняючага камітэту з 22 жніўня, каторы ва ўсіх мястох касуе прыватную ўласнасьць на нерухомасьці. Закладные звыш 10.000 руб. касуюцца. Старые валадзельцы маюць роўные правы с кватэрантамі. Аднак, дэкрэт не абнімае прамышленых прадпрыемств.

На агульным сабраньні новая рада чыгуньнікаў прыняла рэзалюцыю аб паддзержцы савецкага ўраду.

Б. пасол у Лёндоне, Літвіноў, атрымае высокае назначэньне,—як кажуць, месца камісара заграгічных спраў.

МАСКВА. Вярнуўшыся с Фінляндыі, Каменеў заняў выдатнае становішчэ ў маскоўскім народным камісарыяце і пакуль-што ня едзе ў Вену.

З усяго сьвету.

Зямельная разьвязка ў Вэнгрыі.

Вэнгерскі ўрадовы праект:

«Ураду прыналежыць права экспропрыацыі зямель для варочаючыхся салдатаў. У першы чарод адбудзецца экспропрыацыя зямель, якіе былі куплены ў часе вайны,—далей тых, гаспадары каторых—не вэнгерскіе падданые, у трэйці чарод—землі т. зв мёртвай рукі, значыць, касьцельные, фідэікомісы і г. п. Толькі калі не хваце пералічэных зямель, гасударства можэ зрабіць экспропрыацыю прыватнай уласнасьці, якая знаходзіцца ў вольным абароце».

Усе кіраўнічые кругі згодзіліся на гэты праект. Кс. прымас Чэрнох заявіў, што ў часьці, датыкаючай касьцельных зямель, ён нічога проці ўрадовага праекту не мае.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньні.

27.VIII. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал-ан шэфа ф. Бэн'а: Цяжкіе бітвы між Арра і Сомм. На поўначы ад ракі атакі ворагаў не разьвінуліся ад нашага агню ў ваколіцах Рэ На поўдня ад Скарп нашы войскі, пад націскам чысьленых самаходаў і сільнай пяхоты, ўзяты назад з Моншi на вяршыны. Тут наша пяхота і артылерыя сустрэла ворагаў. Пасьля вельмі вострай бітвы ворагі ўварваліся ў Монші-Гэмаn, але былі выкінуты нашай контратакай. Паўторные штурмы проці Шэрізі зламаліся перад вёскай.

З вялікім чыслом панцырных самаходаў ворагі далей штурмавалі наабапал Бапом. Цэнтр бітвы быў між Морі і Бэньятр. Пасьля чысьленых штурмаў ворагі здабылі Моры. Бэньятр пасьля доўгай барацьбы астаўся ў нашых руках. На палудзенным заходзе ад Бапом ворагі здабылі Тілюа і Мартэнпюіш. На рашце фронту паўтараўшыеся да позьнага вечара варожые штурмы крывава зламаліся. Перад і за нашымі лініямі ляжаць разьбітые панцырные самаходы ворагаў. На паўдня ад Мартэнпюіш ворагі наступілі цераз Базантэн на Монтобан. Контратакамі мы выкінулі іх з Монтобан. На паўдня ад Монтобан варожые штурмы адбіты. Нашая лінія йдзе цяпер на заходзе ад Флер і на заходзе ад Лёнгваль на Марікур. У мясцовых бітвах французы здабылі Фрэнуа і Ст.-Мар. На поўначы ад Эп, пры Шавіньні, мы ўзялі 100 палонных. Тут і на поўначы ад Пасьлі варожые штурмы крывава адбіты.

28.VIII Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: Армія генэрала ф. Бэлё ўчора ізноў была ў цяжкіх бітвах. Цэнтр англіцкіх штурмаў быў на паўдня ад Скарп. Масамі панцырных самаходаў і англіцкай і канадзкай пяхоты ворагі памыкаліся прарваць наш фронт наабапал дарогі Арра-Камбрэ. Нашы войскі задзержалі ўдар вялізарных мас людзей і матэр'ялаў у вострых бітвах на фронце Пэлвь Візан-Артуа-Круасі. Наабедзе ворагі сьвежымі сіламі вялі густымі масамі новые штурмы. Яны адбіты. Гэтак сама зламаліся паўторные штурмы проці Пуарі-Нотр-Дам і на паўночным усходзе ад Круасі. Ворагі мелі ўчора найцяжэйшые страты.

Каля абеду бітва перайшла на паўночны бераг Скарп і напалудзень да Морі. Паўторные штурмы ворагаў тут адбіты.

Наабапал Бапом сіла варожых штурмаў, раўнуючы да папярэдняга дня, аслабела. Наабапал места англічане шмат разоў наступалі, але мы іх адкідалі. На поўначы ад Сомм англічане вялі сільные атакі проці нашых ліній між Флер і Кюрлі. Мы іх адбілі і контратакай узялі назад Флер і Лёнгваль, куды ворагі часова ўварваліся. Між Сом і Уаз мы ўзялі нашу лінію назад і аддалі ворагам бяз бітвы Шольн і Руа.

Фронт нямецкага Насьледніка: Бадэнскіе войскі ўзялі штурмам Фюмэт, у даліне Вэль Мы ўзялі ў палон 250 амэрыканцаў. Атака амэрыканцаў проці Базош адбіта с цяжкімі стратамі. У Аргоннах мы пры наступленьні ўзялі ў палон італьянцаў.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРН. Аўстралійскі прэм'ер-міністэр Юг у прамове да аўстралійскіх войск сказаў: „Вы можэце з гэткай самай лёгкасьцю прыйсьці да буйнога вар'ята і гаварыць яму аб брацтве людзей як і казаць немцам аб міры перш, чым іх паб'ецё. Трэба вызваліць сьвет ад ворага міра, гэтае заразьлівае скулы, каторая грозна і для нас у Аўстраліі—з за 12.000 міль. Мір немагчымы, пакуль вы ня вырвеце меча з нямецкіх рук. Вы даб'ецёся сусьветнага міра, хаця б дзеля гэтага трэба было забіць палавіну нямецкага народу“.

Увага „Wil. Z g.“ пішэ с прычыны гэтай прамовы, што брэхня і фальш частым паўтараньнем іх здабываюць падобнасьць да праўды.

ВЕНА (В.Т.Б.). 26.III. **Албанскі тэатр:** Наступленьне генэрала-ан шэфа ф. Фляндэр Бальтін дайшло ўчора здабыцьця Ф'ері і Бэрата. 6 тыдняў таму назад італьянцы, здабыўшы іх, сьвяткавалі станоўчую разьвязку адрыатыцкага пытаньня. Ворагі скінуты з вяршын Спірагрі і Сінія. На верхнім Дэволі мы такжэ пашырылі нашу ўдачу. Страты італьянцаў людзьмі і матэр'яламі надта вялікіе.

ВЕНА (В.Т.Б) 27.VIII. На албанскім тэатры нашы войскі пасунуліся далей у ваколіцах Ф'ері. Наабапал ракі Томоріка штурмам здабыты французкіе пазыцыі, і ворагі прымушэны адступіць.

БЭРН (В.Т.Б.). Паводлуг вестак з Амэрыкі, нямецкая падводная лодка ўзяла на абордаж канадзкі параход „Triumf“. Гэты параход, азброены немцамі і з нямецкімі матросамі, плавае цяпер каля амэрыканскіх берагоў і ўжо затапіў некалькі рыбаловаў.

БЭРЛІН. Паводлуг слоў выратаваных з затопленага амэрыканскага крэйсэра „St. Diego“ людзей, гэтае судно затоплено ня мінай, а нямецкай падводнай лодкай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 27.VIII У заходня-англіцкіх водах мы затапілі 5 параходаў ёмкасьцю 22.000 тонн.

Беларускія народныя песьні.

Дажынкавыя.

Вітэбская губэрня.

Наш хадзяін Дунай,
Хадзяечка, як маліна,
Хадзяіна абманіла.
Наш хадзяін сыту сыціць,
Хадзяечка гарэлачку,
Наш хадзяін гасьцей поіць,
Хадзяенька сямеечку.
Госьці будуць, да паедуць,
А сямейка са мной будзіць!

— —

Зьмяцём поле мяцёлачкай,
Прыдзём дамоў з вясёлачкай.
Выйдзі, выйдзі, гаспадару,
Перайме сваё дабро
У шырокае гумно,
У мядзяныя вароты,
У залатыя пераплёты.

— —

Ай, дабранач, мая круглая ніўка,
Да за добрую жніўку!
Ай спасіба Богу за падмогу:
Што два полі увыбралі,
А трэцяе запахалі,
Як першая спарыньня
Зваліласяз каранья!

Друкавана ў друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.